**УДК 94(476)+94(47)**

# ГІСТОРЫКА-ІДЭАЛАГІЧНЫЯ КАНЦЭПЦЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І ЎРАДАВАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XVIII – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XIX СТСТ.

***С.М. БІТЧАНКА***
***(Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Мінск)***

*Прысвечаны раскрыццю канцэптуальных асноў інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі і выяўленню эвалюцыі дзяржаўнай палітыкі Расійскай Імперыі ў дачыненні да ідэалагічнай накіраванасці гістарычнай адукацыі Паўночна-Заходняга краю ў апошняй чвэрці XVIII – першай чвэрці XIX стст. Разглядаюцца канцэпцыі беларускай гісторыі: паланалітвінізм, балцкі (=літоўскі) літвінізм, русінацэнтрызм. Аналізуецца дзяржаўная адукацыйная палітыка ў дачыненні да вучэбна-гістарычнай літаратуры, прызначанай да выкарыстання на ўзроўнях пачатковай і сярэдняй адукацыі. Адлюстраванне гісторыі Беларусі ў тагачаснай вучэбна-гістарычнай літаратуры разглядаецца па крытэрыі гісторыка-ідэалагічнага стаўлення яе аўтараў да прызнання або непрызнання гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларускага народа.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыка-ідэалагічныя канцэпцыі гісторыі Беларусі, дзяржаўная адукацыйная палітыка Расійскай Імперыі, вучэбна-гістарычная літаратура на ўзроўнях пачатковай і сярэдняй адукацыі.*

У апошняй чвэрці XVIII – першай чвэрці XIX стст. у Расійскай Імперыі пачынаецца фарміраванне гісторыка-ідэалагічных канцэпцый інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі, якія аказалі ўплыў на развіццё гістарычнай адукацыі. Гэтыя канцэпцыі сталі гісторыка-ідэалагічнымі асновамі зместавага напаўнення вучэбнай літаратуры па гісторыі. Фарміраванне канцэптуальных пазіцый аўтараў вучэбных кніг праходзіла пад уплывам палітычнай сітуацыі, а таксама было непарыўна звязана з развіццём гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Працэс назапашвання гістарычных звестак па айчыннай гісторыі можна падзяліць на два перыяды: 1) 1795 – пачатак 1860-х гг.; 2) пачатак 1860-х – 1917 гг. Першы перыяд характарызуецца з'яўленнем беларускага крыніцазнаўства, фарміраваннем "рамантычнай" школы І. Лялевеля, зваротам да гісторыі Беларусі расійскай дваранскай гістарыяграфіі, фарміраваннем плеяды "краёвых" ("мясцовых") даследчыкаў "гісторыі Літвы". Другі перыяд характарызуецца актывізацыяй вывучэння гісторыі Беларусі даследчыкамі заходнерускага кірунка, афармленнем беларускай нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі [2, с. 11]. Паралельны працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў таксама падзяляецца на два перыяды. Паводле А.К. Каўкі, вылучаюцца два этапы беларускага руху: 1) пачаткова-падсвядомы рух "у сабе", які рэалізоўваўся ў рамках польскага нацыянальна-вызваленчага працэсу (1794–1863); 2) рух "для сябе", які ўзнік з пачатку ўсведамлення ўласна беларускіх нацыянальных інтарэсаў (1864–1918) [4, с. 446].

У першай чвэрці XIX стагоддзя пануючай гісторыка-ідэалагічнай асновай інтэрпрэтацыі гісторыі стала канцэпцыя паланалітвінізма. Сфарміравалася яна напрыканцы існавання Рэчы Паспалітай, калі ў дачыненні да Вялікага Княства Літоўскага скарыстоўваўся тэрмін "Літоўская правінцыя", а ўся дзяржава Рэч Паспалітая называлася "Польшчаю". Тэрміны "літвін", "паляк-караняж", "мазур" не скарыстоўваліся для нацыянальнага супрацьпастаўлення. Гэтыя назвы, як адзначае І.А. Марзалюк, з'яўляюцца назвамі рэгіянальнымі, субэтнічнымі, бо ўвесь народ дзяржавы лічыўся палякамі, што маюць адзіную непадзельную Айчыну – Польшчу [8, с. 53]. Адным з прадстаўнікоў паланалітвінізма быў Адам Міцкевіч, які лічыў, што балцкая Літва аднаасобна стварыла Княства і праз Люблінскую унію добраахвотна злучылася з Каронай. Ён лічыў беларускі народ негістарычным, пазбаўленым гістарычнай суб'ектнасці, цалкам залежным ад суседзяў на працягу ўсяго свайго гістарычнага мінулага. Польшча – гэта Карона, і Літва, і Русь. А ўсходнеславянскі (= беларускі) народ лічыўся часткай польскага [8, с. 53]. А. Міцкевіч адназначна атаясамлівае Літву з балцкай краінай, літвінаў (= "люд літоўскі") называе народам цалкам адрозным ад славянаў, народам балцкім. Эліта ж літвінаў, якая зазнала моцны польскі ўплыў, запазычыла высокую польскую мову і культуру, ды праз гэты працэс стала адным народам з польскімі славянамі. Землі Беларусі ў яго кнізе "Гісторыя Польшчы", як падкрэслівае І.А. Марзалюк, выступаюць як цалкам пазбаўленыя дзяржаўнасці, ніколі не жыўшыя самастойным палітычным жыццём: "≤…≥…пасіўная інэртная тэрыторыя, адвечнае поле боя, за якое змагаецца азіяцкая дэспатычная Расія і вольналюбівая дэмакратычная шляхецкая Польшча" [10, с. 22].

Пераважна ўсе інтэлектуалы першай чвэрці XIX стагоддзя, якія апазіцыйна ставіліся да Расійскай Імперыі, лічылі беларусаў народам без традыцый уласнай дзяржаўнасці. Адмоўным стаўленнем да гістарычнасці і суб'ектнасці беларускага народа характарызуецца і канцэпцыя балцкага (=літоўскага) літвінізма. Паводле канцэпцыі, Вялікае Княства Літоўскае – гэта балцкая дзяржава, створаная літоўцамі (= жамойтамі і аўкштайтамі). Балцкая Літва адыгрывала першасную ролю ў стварэнні княства і паступова падначаліла і ўключыла ў свой склад усходнеславянскія землі [8, с. 53–54]. Насельніцтва Беларусі ў папярэдні

падзелам Рэчы Паспалітай час супрацьпастаўляла сваю "рускасць" літоўскую "рускасці" маскоўскай: "мы – яны" і устойліва ўспрымала Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і Рэч Паспалітую як "сваю" дзяржаву, але толькі як "сучасную Бацькаўшчыну", якая ў кантэксце пэўных абставінаў заняла месца "даўняй Бацькаўшчыны" – Кіеўскай Русі [9, с. 9, 188, 198].

Пасля далучэння "Западнаго края къ Имперіи", як адзначае І.П. Карнілаў, асаблівасці края, якія склаліся пры польскім урадзе, не маглі змяніцца ў кароткі час. Кацярына ІІ жадала вярнуць краю яго старажытны, рускі выгляд, але не паспела дакончыць пачатага паступовага ўвядзення рускіх школ і рускіх парадкаў [18, с. 58]. На "Западныя губерніи" яна глядзела, як на карэннае, найстаражытнае "достояніе" Расіі. Далучэнне іх да Імперыі ў 1772, 1793, 1795 гадах яна прызнавала "возвращеніемъ похищеннаго и возстановленіемъ законнаго, историческаго права Русскаго государства". На медалі ў памяць далучэння да Расіі "Русско-Литовскихъ областей" напісаны словы: "отторженная возвратихъ" [18, с. 47]. Кацярына ІІ падкрэслівала менавіта рускую існасць Вялікага Княства Літоўскага і тлумачыла гэта тым, што ў Вялікім Княстве ўсе справы ва ўсіх судах вяліся на рускай мове, што ў літоўскіх архівах усе акты пісаны рускімі літарамі на рускай мове, што гады пазначаліся ад стварэння свету па грэчаскаму царкоўнаму злічэнню, што грэчаская вера ва ўсім Вялікім Княстве была панавальнай і яе вызнавалі Вялікія Князі [18, с. 47–48]. Далучаныя ўсходнеславянскія землі разумеліся Кацярынай ІІ як "Заходні край" Расіі: "≤…≥…эта наша древнѣйшая, коренная старина, этотъ оплотъ Православія и русской народности, въ продолженіе болѣе двухъ вѣковъ находился подъ тяжелымъ и безпощаднымъ гнетомъ враждебной России польско-латинской тираніи, отъ которой Западная Русь была наконецъ освобождена" [5, с. 3]. Як падкрэсліваў у будучым П.А. Сталыпін: "Ясно стремленіе этой Государыни укрѣпить еще струящіеся въ краѣ русскія теченія, вливъ въ нихъ новую русскую силу для того, чтобы придать всему краю прежнюю русскую государственную окраску" [22].

У заканадаўчых актах часоў валадарання імператрыцы Кацярыны ІІ далучаныя ўсходнеславянскія (= беларускія) тэрыторыі згадваюцца як "присоединенныя на вѣчныя времена къ Имперіи Россійской отъ Рѣчи Посполитой Польскія Области, нѣкогда съ нею соединенныя, потомъ въ смутныя времена отторгнутыя", "Русско-Литовскія области", "присоединенныя отъ Польши къ Имперіи нашей земли", "Бѣлорусскія Губерніи, отъ Польши присоединенныя", "новопріобретенныя отъ Польши области" [13, с. 553; 14, с. 418–420]. У часы праўлення імператара Паўла І (1796–1801) "возвращеніе Западной России къ первоначальному своему Русскому типу" спынілася. Меркавалася, што ў "Западномъ краѣ" шматгадовая барацьба "началъ русско-славянскихъ и польско-латинскихъ" скончана. У заканадаўчых актах Паўла І усходнеславянскія тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага згадваюцца як "новопріобретенныя губерніи" [15, с. 578]. Праваслаўнае насельніцтва, паводле І.П. Карнілава, зноў было пакінута, як і ў часы Рэчы Паспалітай, у невуцтве і залежнасці ад каталіцкай шляхты, якая зноў заняла пераважнае грамадскае становішча [18, с. 59–60].

Уступіўшы на трон 12 сакавіка 1801 года імператар Аляксандр І падпісаў маніфест, у якім быў абвешчаны палітычны прынцып кіравання народам Расійскай Імперыі: "≤…≥…по законамъ и по сердцу въ Бозѣ почивающей Августѣйшей Бабки Нашей, Государыни Императрицы Екатерины Великія, коея память Намъ и всему Отечеству вѣчно пребудетъ любезна, да по Ея премудрымъ намѣреніямъ шествуя, достигнемъ вознести Россію на верхъ славы и доставить нерушимое блаженство всѣмъ вѣрнымъ подданнымъ Нашимъ" [15, с. 583]. Аднак у дачыненні да "заходніх губерняў" ён не стаў вяртацца да кацярынінскай палітыкі, якая праводзілася "съ цѣлью мирнаго, культурнаго сліянія этихъ губерній съ восточною Россіею" [18, с. 58]. У выніку новага палітычнага стаўлення, як падкрэсліваў І.П. Карнілаў, "≤…≥…судьба Западнаго края быстро измѣнилась и для него опять настало трудное, тяжелое время особенно въ первыя 60 лѣтъ истекшаго столѣтія. Онъ оказался задавленнымъ польскимъ національнымъ и отчасти религіознымъ игомъ и почти забытымъ всѣмъ остальнымъ русскимъ миромъ" [5, с. 3]. Народная адукацыя "Западнаго края" была выключана з кампетэнцыі расійскага ўрада і даверана польскім патрыётам. Каталіцкае шляхецкае асяроддзе праз адукацыйную дзейнасць працягвала фармаваць польскіх патрыётаў, якія на рэгіянальным узроўні адчувалі сябе ліцвінамі. Часта яны з сімпатыяй адклікаліся пра беларускіх сялян, не атаясамляючы пры гэтым сябе з імі. Павел І і Аляксандр І не прымалі антыпольскіх русіфікацыйных мер. У гэтай сувязі польскі ўплыў на землях былога Княства хутка аднавіўся і да канца першай чвэрці ХІХ стагоддзя перавышаў расійскі.

У перыяд праўлення імператара Аляксандра І (1801–1825) на беларускіх землях стала дамінаваць палітыка паланізацыі, а канцэпцыя палоналітвінізма не толькі не пахіснулася, але працягвала дамінаваць у вучэбнай літаратуры і пасля ўрадавых адукацыйных рэформаў. У выніку рэформаў было ўтворана Міністэрства народнай асветы, а сістэма адукацыі стала больш цэнтралізаванай [21; 11, с. 290]. У 1803 годзе ўсе навучальныя ўстановы Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай губерняў, а з 1807 года Беластоцкай вобласці, сталі падпарадкоўвацца Віленскаму ўніверсітэту і ўвайшлі ў склад Віленскай вучэбнай акругі, якая аб'яднала ў сваіх межах "всѣ коренныя Русско-Литовскія области, захваченныя въ XVI вѣкѣ Польшею и при Екатеринѣ II освобожденныя и возвращенныя России" [19, с. 1–2]. Папячыцелем акругі быў прызначаны польскі магнат Адам Чартарыйскі (ілюстрацыя 1), адзін з сяброў Аляксандра І [12, с. 132]. Дзяржаўныя і падкантрольныя дзяржаве прыватныя ўстановы адукацыі ажыццяўлялі сваю дзейнасць у інтарэсах Расійскай Імперыі, але Віленская вучэбная акруга ў часы папячыцельства князя А. Чартарыйскага ажыццяўляла адукацыйную паліты-

ку польскай накіраванасці. Аляксандр I спачатку ставіўся да гэтага лаяльна, што магчыма было звязана з яго сяброўскімі адносінамі з А. Чартарыйскім і "былъ полонъ стремленій возстановить Польшу во всѣмъ ея первоначальномъ объемѣ. Можно сказать, что до самаго 20 года императора не покидали эти мечты, и онъ не разъ объявлялъ о нихъ громогласно, особенно тогда, когда находился въ польскомъ обществѣ" [20, с. 5]. У 1806 годзе, як адзначае А.Л. Пагодзін, польскае грамадства было ахоплена напружаным чаканнем "рѣшительнаго шага государя въ сторону возстановленія – Польскаго королевства на правахъ государства, связаннаго съ Россіей, какъ Венгрія съ Австріей" [20, с. 6]. У 1811 годзе Аляксандр I, выступаючы ў Вільні, абвесціў свае планы аб аднаўленні Польшчы і аб далучэнні да яе "Литовскаго княжества" "со включеніемъ русскихъ областей, за изъятіемъ Бѣлоруссіи, такъ, чтобы границами были Двина, Березина и Днѣпръ" [20, с. 5, 8]. У 1815 годзе Царства Польскае атрымала тое, чаго не было ў самой Расійскай Імперыі – Канстытуцыю. Згодна з ёй, выканаўчая ўлада належала расійскаму імператару, які адначасова быў польскім каралём, заканадаўчая размяркоўвалася паміж каралём і соймам. У польскіх колах выказвалі надзею, што дзеянне Канстытуцыі Царства Польскага будзе перанесена на беларускія і літоўскія землі. Але гэтага не адбылося і Расійская Імперыя "удержала свои польскія области" [20, с. 5]. Цікавае меркаванне наконт палітыкі Аляксандра I выказаў К.П. Пабеданосцаў: "Александръ I любилъ Россію и народъ свой; но его воспитаніе не дало ему возможности узнать ни исторію страны своей, ни народъ свой ≤…≥; (он) мечталъ о возстановленіи Польши, не зная исторіи, которая сказала бы ему, что царство Польское означаетъ рабство и угнетеніе для всего Русскаго народа" [19, с. 43].



**Адам Чартарыйскі**

Адукацыйная дзейнасць пачатковых і сярэдніх навучальных устаноў Расійскай Імперыі рэгламентавалася зацверджаным у 1804 годзе заканадаўчым актам, які меў назву "Уставъ учебныхъ заведеній, подчиненныхъ университетамъ". Аднак гэты статут распаўсюджваўся на пяць вучэбных акруг, за выключэннем Віленскай. Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі Адам Чартарыйскі, рэктар Віленскага ўніверсітэта Геранім Страйноўскі і граф Ігнацы Патоцкі распрацавалі для зацвярджэння асаблівыя ўніверсітэцкія і школьныя статуты [12, с. 132]. Дзейнасць Віленскай вучэбнай акругі на чале з Віленскім універсітэтам стала ажыццяўляцца на падставе наступных заканадаўчых актаў: "Актъ утвержденія для Императорскаго Университета въ Вильне", "Уставъ или общія постановленія Императорскаго Виленского Университета и училищъ его округа", "Предначертаніе устроенія училищъ въ Округѣ Императорскаго Виленского Университета" [1, с. 526; 23, с. 610; 16, с. 269]. У гэтых дакументах усходнеславянскія (=беларускія) землі трактаваліся як тэрыторыі "преждебывшихъ Польскихъ областей, присоединенныхъ къ России" [23, с. 615].

Разам з заканадаўчымі актамі для ўстаноў адукацыі Віленскай вучэбнай акругі была распрацавана праграмна-метадычная і вучэбная літаратура, якая была з польскай ідэалагічнай накіраванасцю. Паводле яе зместу, як адзначае Р.Я. Кіпрыяновіч, у вучылішчах моцна падтрымлівалася польская нацынальнасць. Пры выкладзе вучэбнага матэрыяла пераважна не адлюстроўвалі рускую гісторыю і магутнасць Расійскай Імперыі, але затое ўзвялічвалі хараство "краю Польскаго", адукаванасць, дабрачыннасць палякаў, іх прыродную здольнасць да ўсяго і вялікую заслугу ў поспехах вытанчанай славеснасці; з цеплынёй праслаўлялі мужнасць, непераможнасць польскіх ваяроў. У гэтай сувязі, як падкрэслівае І.М. Сбітнеў, польская адукацыйная накіраванасць несла пэўны ідэалагічны ўплыў на самасвядомасць вучняў: "Оттого юноши не любили Россіи, но обожали Польшу. Россія оставалась для учениковъ неизвѣстной; зато исторія Польши была извѣстна со всѣми подробностями, и они не сомнѣвались въ возрожденіи Польши на основаніи понятій, какія имъ внушались въ школѣ" [19, с. 53].

Праграмы для складання вучэбных кніг для ўстаноў адукацыі Віленскай вучэбнай акругі выдаваліся на падставе 55-га артыкула Статута ўніверсітэта: "Общее Собраніе Виленскаго университета, по разсмотрѣніи всѣхъ книгъ, изданныхъ для училищъ его округа, имѣетъ представить объ нихъ своему Попечителю, по мнѣнію коего дѣлаетъ нужныя перемѣны или поправки. Касательно жъ начальныхъ книгъ, въ коихъ имѣется недостатокъ, оное жъ Собраніе, относясь къ Попечителю, должно издать программы, съ назначеніемъ награжденія тѣмъ, коихъ сочиненія удовлетворять предложенному предмету, и по одобренію Университета и Попечителя приняты будутъ для обученія по онымъ въ училищахъ округа" [23, с. 620]. Палажэнні статута Адукацыйнай камісіі пасля ўзгаднення з міністрам народнай асветы П.В. Завадоўскім былі пакладзены ў аснову заканадаўчых адукацыйных актаў. Паводле палажэнняў, на першы план было вылучана "права народовъ". Згодна статуту Адукацыйнай камісіі, як адзначае Е. Крыжаноўскі, выкладанне гісторыі, "не направленное къ воспитанію сердца, къ возбужденію любви къ добродѣтели, къ исправленію поступковъ, — преподаваніе, выставляющее передъ учениками величіемъ то, что было пустымъ дѣломъ, храбростью, что было насиліемъ, политикой — хитрость, ставящее въ примѣръ то, что служитъ соблазномъ, такое преподаваніе исторіи заражаетъ сердцѣ и даѣтъ моло-

дому уму направленіе, вредное для общественности" [20, с. 17]. Пры гэтым асобны параграф праграмы 1807/1808 навучальнага года рэкамендаваў засваенне наступнага прынцыпу: "< …> каждый народъ можетъ поступать согласно правиламъ естественной справедливости, независимо отъ какихъ бы то ни было принциповъ и убѣжденій, которыя управляютъ другими народами" [20, с. 17].

Адзначаючы спецыфіку "Устава для Виленскаго университета и школъ его округа", старшыня часовай камісіі па ўладкаванні і кіраванні Віленскай публічнай бібліятэкі і музея У.В. Крачкоўскі прыводзіць цытату з ліста Г. Калантай Т. Чацкаму ад 30 жніўня 1803 года: "Чарторыйскій и Стройновскій наибольшее почерпаютъ для себя утѣшеніе въ томъ, что въ неприкосновенности сохранили почти всю систему эдукаціонной комиссіи" [6, с. 27]. Паводле У.В. Крачкоўскага, адукацыйная камісія "значительно подняла, а мѣстами возбудила и проявила общественное польское національное настроеніе. Многіе въ Польшѣ стали нападать теперь на заграничное воспитаніе, на домашнее обученіе, при помощи исключительно гувернеровъ-иностранцевъ, требовали воспитанія для всѣхъ въ польскомъ духѣ, польскомъ направленіи" [6, с. 25]. Адукацыя і выхаванне ў большасці шляхецкіх сем'яў была накіравана на захаванне польскай нацыянальнай самасвядомасці і на аднаўленне Рэчы Паспалітай. Некаторая абасобленасць Віленскай вучэбнай акругі ў адносінах да новай сістэмы асветы, як адзначае У.С. Пасэ, з'яўлялася па сутнасці саступкай расійскага ўраду палітычным і нацыянальна-рэлігійным інтарэсам "усё яшчэ панаваўшых тут польскіх памешчыкаў і каталіцкай царквы" [12, с. 133].

На пасадзе папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі А. Чартарыйскі даваў наступную характарыстыку сваёй дзейнасці: "Мнѣ кажется небезполезнымъ замѣтить, что въ слѣдующія годы (послѣ назначенія) вся поверхность Польши покрылась школами, въ которыхъ польскому чувству былъ данъ полный просторъ для развитія" [20, с. 7]. Яго адукацыйныя погляды былі непарыўна звязаны з яго светапоглядным стаўленнем да Польшчы: "Любовь къ отечеству, къ его славѣ, къ его учрежденіямъ и правамъ внѣдрилась въ наши души путемъ преподаванія и всего того, что мы слышали вокругъ себя" [20, с. 3]. Аднак сярод прадстаўнікоў навуковай і педагагічнай супольнасці Расійскай Імперыі, як адзначае А.Л. Пагодзін, выказвалася меркаванне, што для А. Чартарыйскага "образованіе было не цѣлью для просвѣщенія и благосостоянія народа, а лишь средствомъ для ополяченія русскаго края" [20, с.1].

Пасля ўключэння ўсходнеславянскіх земляў у склад Расійскай Імперыі, як сведчыць Тадэвуш Чацкі ў сваёй справаздачы за 1803 год, выкладанне мясцовай гісторыі ў сярэдняй школе было адменена [20, с. 12]. Аднак пасля прызначэння А. Чартарыйскага выкладанне мясцовай гісторыі аднаўляецца, але ў святле польскай гісторыка-ідэалагічнай накіраванасці. Пры выкладанні гісторыі пашыралася выкарыстанне ў адукацыйным працэсе падручніка "Historia narodu polskiego". Яго аўтарам быў польскі гісторык Адам Нарушэвіч, які не бачыў вялікай розніцы паміж польскай культурай і культурай насельніцтва Беларусі.

У зместавым напаўненні праграмна-метадычнай і вучэбнай літаратуры была выразна адлюстравана думка А. Чартарыйскага наконт усходнеславянкіх земляў як неад'емных польскіх тэрыторый. Галоўнай мэтай адукацыі, пакладзенай у аснову вучэбных праграм, у гэты час стала "воспитаніе гражданъ для спасенія Польши" [20, с. 12]. А. Чартарыйскі падкрэсліваў неабходнасць "возстановить Польшу, присоединивъ къ ней ея старыя литовскія и украинскія провинціи" [20, с. 1]. Уяўленні князя пра рускую гісторыю і яе стаўленне да польскай былі палітызаванымі. Палякі, паводле А. Чартарыйскага, "идиллическіе земледельцы, не помышлявшіе о завоеваніяхъ и мечтавшіе только о томъ, чтобы ихъ не трогали" [20, с. 3]. Згодна А.Л. Пагодзіну, сучаснікі характарызавалі А. Чартарыйскага "какъ пропагандиста польской идеи въ Литовскихъ, Бѣлорусскихъ і Украинскихъ губерніяхъ, которыя онъ хотелъ, непременно, выдать за истинную Польшу" [20, с. 7]. Сенатар М.М. Навасільцаў лічыў, што нацыянальная самасвядомасць насельніцтва гэтага краю ўяўляла Расію, як "могущественную покровительницу своей самобытной духовной жизни и ни мало не помышлявшаго о политическомъ отдѣленіи отъ нея" [20, с. 92]. Паводле М.М. Навасільцава, адукацыйная дзейнасць А. Чартарыйскага адсунула зліццё Польшчы з Расіяй і "обрусѣніе Литвы" на сто гадоў: "≤…≥…если, зная настроеніе князя Адама, ему нашли возможнымъ дать свободу дѣйствій въ Виленскомъ округѣ, ничего другого нельзя было и ожидать. Политическія событія только поощряли эту полонофильскую дѣятельность" [20, с. 4, 7]. Сам А. Чартарыйскі ўказваў на абуральную супярэчнасць паміж яго патрыятычнымі сімпатыямі да Польшчы і пачуццямі, якімі ён павінен быў кіравацца, займаючы найбольш адказныя і важныя пасады ў Расійскай Імперыі. І ў гэтай сувязі пастаянна прасіў вызваліць яго ад "рускай службы" [20, с. 4].

Паводле І.П. Карнілава, які ўваходзіў у Савет міністраў народнай асветы, з заснаваннем Віленскай вучэбнай акругі і падпарадкаваннем усіх вучылішч акругі польскаму патрыёту А. Чартарыйскаму і Віленскаму ўніверсітэту "русскія народныя училища Западныхъ губерній не только окончательно утратили всякое вліяніе и значеніе, но измѣнили первоначальному своему Русскому характеру и обратились въ орудіе полонизма" [18, с. 47]. За час кураторыі А. Чартарыйскага, як адзначае А.Л. Пагодзін, дух паланізму вельмі моцна ўліваўся ў масы, а польскія парафіяльныя школы ўносілі ў народ ідэалы каталіцызму і "съ нимъ неразлучнаго полонизма" [20, с. 81]. Уніяцкі святар Іосіф Сямашка адзначаў, што юнацтва ў публічных вучылішчах не мае ведаў ні аб Расіі, ні аб рускім народзе, не ведае яго гісторыі, мовы і літаратурных твораў [19, с. 57]. Школы рускай накіраванасці ў гэты час былі толькі ў Віцебскай губерні і ў нешматлікай колькасці. Свецкія сярэднія вучылішчы

знаходзіліся ў руках або нецярпімага ў дачыненні да Расіі каталіцкага духавенства, або выхаванцаў Віленскага ўніверсітэта, якія ставілі мясцовыя патрыятычныя мэты [20, с. 82].

У афіцыйных дакументах тэрыторыі былога Княства атрымалі назвы "Литовскія і Бѣлорусскія губерніи","Бѣлоруссія" [3, с. 182]. Расійскі ўрад таго часу не глядзеў на Літву, Беларусь і Украіну, як на свае складовыя спрадвечныя часткі, а лічыў іх "польскими провинціями съ государственнымъ польским языкомъ" і не процідзейнічаў таму, каб і ўся школа тут была "проникнута темъ же духомъ". Толькі прыезд М.М. Навасільцава ў Вільню і яго дзейнасць паклалі мяжу "смелому" паступальнаму руху духоўных і свецкіх кіраўнікоў выхавання. Але прынятыя ім меры, як адзначае А.Л. Пагодзін, не здолелі садзейнічаць "умиротворенію края и его сліянію съ Россіей" [20, с. 82]. Паводле І.П. Карнілава, адукацыйная палітыка А. Чартарыйскага – гэта "глубокое зло, которое онъ нанесъ не только русскому населенію въ Западной Россіи, но и тамошнимъ Полякамъ, возбуждая въ послѣднихъ политическія стремленія къ недостижимой цѣли и обрекая ихъ кровавымъ бѣдствіямъ, разоренію и разочарованіямъ" [19, с. 93].

Польскаарыентаваная адукацыйная палітыка садзейнічала замацаванню гісторыка-ідэалагічнай канцэпцыі палоналітвінізму не толькі ў вучэбна-гістарычных выданнях для навучальных устаноў, але і ўвогуле ва ўсёй літаратуры, аўтарамі якой былі прадстаўнікі польскамоўнай антырасійскай інтэлектуальнай эліты Беларусі. Таму сярод літаратуры гэтага гісторыка-ідэалагічнага кірунку, як падкрэслівае І.А. Марзалюк, "марна шукаць тэкстаў, у якіх была б суб'ектывавана гісторыя Беларусі, тым больш гісторыя ўласна беларускага народа, ці ў якасці суб'екта стваральніка, ці ў якасці раўнапраўнага стваральніка Вялікага Княства Літоўскага. Прынамсі іх пакуль ніхто не знайшоў і ёсць сур'ёзныя сумневы, што калі-небудзь знойдзе" [8, с. 54].



**Мікалай Навасільцаў**

Неадпаведнасць адукацыйнай палітыкі польскай гісторыка-ідэалагічнай накіраванасці дзяржаўным інтарэсам Расійскай Імперыі было ўсвядомлена толькі напрыканцы праўлення імператара Аляксандра І. У пачатку 1820-х гг. у шэрагу навучальных устаноў Віленскай вучэбнай акругі пачалі дзейнічаць таемныя таварыствы "філаматаў і філарэтаў", у якіх прымалі ўдзел выкладчыкі і навучэнцы. З 1824 года пачаліся рэпрэсіі супраць іх удзельнікаў. Віленскаму ўніверсітэту было прапанавана перагледзець усе навучальныя планы і вучэбную літаратуру для ўстаноў пачатковай і сярэдняй адукацыі. У гэтым жа годзе замест А. Чартарыйскага папячыцелем акругі быў прызначаны М.М. Навасільцаў (ілюстрацыя 2). 31 кастрычніка 1824 года навучальныя ўстановы Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі падпарадкаваны Пецярбургскай вучэбнай акрузе. Гэта адбылося пасля даклада Беларускага генерал-губернатара М. Хаванскага, у якім ён адзначаў, што школы гэтых губерняў "паланізуюць моладзь". Дзяржаўныя мерапрыемствы, якія праводзіліся Аляксандрам І, а яшчэ раней і Паўлам І, прывялі да таго, што хутка ўвесь "Западный край" прыняў зноў польскае аблічча.

У гэты ж самы час, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у асяроддзі лаялістаў у дачыненні да Расійскай Імперыі выявілася русінацэнтрычнае разуменне гісторыі ўсходнеславянскіх (=беларускіх) земляў былога Вялікага Княства Літоўскага. Гэта разуменне таксама адмаўляла гістарычную суб'ектнасць беларусаў. Прадстаўнікі гісторыка-ідэалагічнай канцэпцыі русінацэнтрызма не бачылі трагедыі ў знікненні Рэчы Паспалітай і звязвалі свой асабісты лёс з Расіяй. Усе творцы новай канцэпцыі гісторыі Беларусі, як падкрэслівае І.А. Марзалюк, былі людзьмі польскай культуры, якая была для іх першай "высокай культурай", першай формай іх інтэлектуальнай сацыялізацыі. Сярод іх можна знайсці і рыма-католікаў, і ўніятаў, і праваслаўных [8, с. 54]. Паводле канцэпцыі, Беларусь – гэта не што іншае, як Заходняя Расія, альбо Заходняя Русь. Гісторыя Русі (Расіі) – гэта адно народнае зыходнае адзінства, якое было разарвана феадальнай дробнасцю і захопніцкімі дзеяннямі суседзяў, якія скарысталіся наступствамі мангольскага нашэсця. У выніку землі Заходняй Русі сталіся здабычай Літвы [8, с. 54]. Паступова пашыраюцца ўяўленні, як падкрэслівае І.П. Крыпякевіч, што "Білорусь се край з давна российський, що Білоруси се частина российського народа" [7, с. 1]. Іосіф Сямашка ў 1827 годзе пісаў, што рускі народ з'яўляецца адзіным: "Западно-Русскій народъ, отторженный въ смутныя времена Литвою отъ Россіи и послѣ присоединенный къ Польше" [19, с. 56]. Сярод аўтараў гэтай канцэпцыі вылучаюцца знакамітыя грамадскія дзеячы: Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, Іван Грыгаровіч, Зарыян Даленга-Хадакоўскі.

Перыяд апошняй чвэрці XVIII – першай чвэрці XIX стст. стаў часам пашырэння гісторыка-ідэалагічнага супрацьстаяння ў "Заходняй Русі", калі сутыкнуліся паміж сабой процілеглыя царкоўныя, культурныя і палітычныя прынцыпы. Адзін з гэтых прынцыпаў вызначаўся імкненнем "къ торжеству въ Западной Россіи Польши и Римскаго католичества", а іншы прынцып стаў асновай імкнення "за объединеніе Западной

и Восточной Россіи и за возстановленіе въ Западно-Русскомъ народ древняго православія” [19, с. 52]. Шляхта Беларусі, як адзначае Р. Радзік, мысліла ў катэгорыі “Gente Lithuanus (Ruthenus), natione Polonus” – “Літвін (русін) па паходжанні, паляк па нацыянальнасці”. Беларускасць успрымалася шляхтай на ўзроўні “рускага роду”, які часта называўся “літоўскім”. Але нягледзячы на ўсведамленне сваёй “рускасці”, шляхта не стала базай беларускага нацыянальнага руху [17, с. 218–219]. Значная колькасць беларусаў-каталікоў, прадстаўнікоў шляхецкай інтэлігенцыі краю, будучы “беларусамі” па паходжанні, маючы любоў да тэрытарыяльнай Радзімы і яе багатай гісторыі, разумелі і ацэньвалі жыццё беларускага народа з польскага пункту гледжання. Украінскі гісторык і педагог Іван Крыпякевіч меркаваў, што беларускае адраджэнне пачалося ўжо напрыканцы XVIII стагоддзя. Менавіта ў гэты час інтэлігенцыя пачала набліжацца да народа: адным падабаліся беларускія народныя песні і апавяданні, а іншыя хацелі далучыць народ да сваіх спраў і інтарэсаў. Беларускую народную мову пачалі ўжываць польскія шляхцічы, якія хацелі мець сялян на сваім баку, каб настроіць іх супраць Расіі. Але для дабра народа, як мяркуе І.П. Крыпякевіч, яны не зрабілі нічога: “< …> тільки дурили безпросьвітних людий, що Білорусь се частина Польщі, що на Білоруси треба завести назад польське пановањє, а тоді настане рівність і воля, всї житимуть в богатстві і щастю” [7, с. 5–6].

Такім чынам, за акрэслены перыяд з 1772 па 1825 гг. пад уплывам дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да ідэалагічнай накіраванасці гістарычнай адукацыі Расійскай Імперыі ў пэўнай паслядоўнасці ўзнікаюць, атрымліваюць развіццё і пачынаюць паралельна суіснаваць канцэпцыі, якія адмаўлялі гістарычнасць і дзяржаваўтваральную суб’ектнасць беларускага народа: палоналітвінізм, балцкі (=літоўскі) літвінізм, русінацэнтрызм (у пазнейшы час фарміруюцца канцэпцыі: тэорыя афіцыйнай народнасці, заходнерусізм). Гісторыка-ідэалагічныя асновы дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі вызначальна паўплывалі на фарміраванне польскацэнтрычнага і расійскацэнтрычнага вобраза гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні вучэбна-гістарычнай літаратуры, прызначанай для выкарыстання ў пачатковых і сярэдніх навучальных установах “Заходняй Русі”.

ЛІТАРАТУРА

1. Акт утверждения для Императорского Университета в Вильне // Полное собрание законов Российской Империи. Собрание Первое. 1649–1825 гг. – Т. XXVII (1802–1803) / под ред. М.М. Сперанского. – СПб. : тип. II Отделения Собственной Его Императорского Величества, 1830. – С. 526–530.
2. Белазаровіч, В.А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі : дапаможнік / В.А. Белазаровіч ; пад агульн. рэд. І.П. Крэня, А.М. Нечухрына. – Гродна : ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006. – 231 с.
3. Дополнение к Сборнику постановлений по Министерству народного просвещения, 1803–1864 гг. – СПб. : тип. Императорской академии наук, 1867. – 590 с.
4. Каўка, А. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух / А. Каўка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 445–448.
5. Корнилов, И. Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы для истории Виленского учебного округа преимущественнно в Муравьевскую эпоху / И. Корнилов. – СПб. : тип. А. Лопухина, 1901. – 420 с.
6. Крачковский, Ю.Ф. Исторический обзор деятельности управления Виленского учебного округа, 1803–1903 гг. : в 3 ч. / под общ. ред. А.В. Белецкого. – Ч. 1, отд.: 1803–1832 гг. / сост. Ю.Ф. Крачковский. – Вильна : тип. А.Г. Сыркина, 1903. – 565 с.
7. Крипякевич, І.П. Білоруси // Просьвітні листки. – Ч. 30. – Львов : тов. “Просьвіта”, 1909. – 16 с.
8. Марзалюк, І.А. Вытокі беларускага заходнерусізму і літвінізму / І. Марзалюк // Беларус. думка. – 2012. – № 8. – С. 53–59.
9. Марзалюк, І.А. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.) / І.А. Марзалюк. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 324 с.
10. Марзалюк, І.А. Ля вытокаў нацыянальнай тоеснасці. Гістарычны наратыў і яго ўплыў на нацыянальную свядомасць у Беларусі канца XVIII–XIX стст. // 1917 год у гістарычных лёсах Беларусі : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 ліст. – 1 снеж. 2017 г. / рэдкал.: А.Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск. : Выд. цэнтр БДУ, 2017. – С. 19–34.
11. Нарысы гісторыі Беларусі : ў 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1 – 527 с.
12. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / рэд-кал.: С.А. Умрэйка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Народ. асвета, 1968. – 623 с.
13. Полное собрание законов Российской Империи : в 48 т. – Т. XIX (1770–1774). – Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 года. – СПб. : тип. II Отделения Собственной Его Императорского Величества, 1830. – 1083 с.
14. Полное собрание законов Российской Империи : в 48 т. – Т. XXIII (1789–1796). – Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 года. – СПб. : тип. II Отделения Собственной Его Императорского Величества, 1830. – 974 с.
15. Полное собрание законов Российской Империи : в 48 т. – Т. XXVI. – № 19779 : Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 года. – СПб. : тип. II Отделения Собственной Его Императорского Величества, 1830. – 880 с.
16. Предначертание устроения училищ в Округе Императорского Виленского Университета (20 авг. 1804) // Сборник постановлений по министерству народного просвещения, 1802–1825. – Т. 1. – СПб. : тип. В. С. Балашева, 1875–1876. – С. 238–253.
17. Радзік, Р. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX–XX ст. // Беларускі гістарычны агляд: навуковы часопіс / навук. рэд. Г. Сагановіч. – Т. 2, сшытак 2. – 1995. – С. 195–229.

18. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива Министерства народного просвещения. – Т.1 (1783–1803). – СПб. : тип. Общественная польза, 1893. – 143 с.
19. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива Министерства народного просвещения. – Т.2 (1802–1804). – СПб. : Синод. тип., 1897. – 1160 с.
20. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива Министерства народного просвещения. – Т.4 (1803–1831). – СПб. : тип. П.П. Сойкина, 1902. – 432 с.
21. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. Т. 1 : Царствование императора Александра I, 1802–1825 гг. – СПб. : тип. Императорской академии наук, 1864. – 905 с.
22. Столыпин, П.А. Нам нужна великая Россия. Полное собрание речей в Государственной думе и Государственном совете (1906–1911). – М. : Молодая гвардия, 1991. – 416 с.
23. Устав или общие постановления Императорского Виленского Университета и училищ его округа // Полное собрание законов Российской Империи. Собрание Первое. 1649–1825 гг. – Т. XXVII (1802–1803) / под редакцией М.М. Сперанского. – СПб. : тип. II Отделения Собственной Его Императорского Величества, 1830. – С. 610–620.


*Пастyпiў 19.03.2021*

## HISTORICAL AND IDEOLOGICAL CONCEPTS OF THE HISTORY OF BELARUS AND THE GOVERNMENT EDUCATIONAL POLICY OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE LAST QUARTER OF THE XVIII – FIRST QUARTER OF THE XIX CENTURIES

***S. BITCHANKA***

*The article is devoted to the conceptual foundations of the interpretation of the history of Belarus and the identification of the evolution of state policy of the Russian Empire against the ideological orientation of historical education of the Northwest territory in the last quarter of XVIII – first quarter of the XIX centuries. Discusses the concept of Belarusian history: palonalitvinizm, baltic (=lithuanian) litvinizm, rusinocentrizm. The article analyzes the state educational policy in relation to educational and historical literature intended for use at the levels of primary and secondary education. The reflection of the history of Belarus in the then educational and historical literature is considered according to the criterion of the historical and ideological attitude of its authors to the recognition or non-recognition of the historical and state-forming subjectivity of the Belarusian people.*

***Keywords:*** *historical and ideological concepts of the history of Belarus, state educational policy of the Russian Empire, educational and historical literature at the levels of primary and secondary education.*

## ИСТОРИКО-ИДЕОЛОГИЧЕСКИЕ КОНЦЕПЦИИ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ПРАВИТЕЛЬСТВЕННАЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНАЯ ПОЛИТИКА РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В ПОСЛЕДНЕЙ ЧЕТВЕРТИ XVIII – ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ XIX ВВ.

***С. БИТЧЕНКО***

*Анализируются концептуальные основы интерпретации истории Беларуси и выявляется эволюция государственной политики Российской империи в отношении идеологической направленности исторического образования Северо-Западного края в последней четверти XVIII – первой четверти XIX вв. Раскрываются концепции белорусской истории: полоналитвинизм, балтский (=литовский) литвинизм, русиноцентризм. Анализируется государственная образовательная политика в отношении учебно-исторической литературы, предназначенной к использованию на уровнях начального и среднего образования. Отражение истории Беларуси в учебно-исторической литературе того времени рассматривается по критерию историко-идеологического отношения ее авторов к признанию или не признанию исторической и государствообразующей субъектности белорусского народа.*

***Ключевые слова:*** *историко-идеологические концепции истории Беларуси, государственная образовательная политика Российской Империи, учебно-историческая литература на уровнях начального и среднего образования.*